# Калейдаскоп

верасень 2022

**Школьная газета №1 (41)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

---

**З першых хвілін да апошняга дня**
**Дыхае мовай жывой, як паветрам,**
**Там чалавек, дзе шануе радня**
**Божы дарунак – галоўны і вечны.**

**Будзе нязводным народ, у якім**
**Слова і душы трымаюцца злітна.**
**Мова любая – стасунак людскі,**
**Родная мова – святая малітва** ***(С. Законнікаў).***

**Спакон вякоў пяе народ,**
**І песні б’юць жывой крыніцай.**
**Мы плыні тых крыштальных вод**
**Спяшым з прыемнасцю напіцца.**
**З грамадскіх сходзячых дарог,**
**Мы часта йдзём у цень дубровы**
**Грудзьмі прылегчы на мурог**
**І чэрпаць з гукаў роднай мовы**

**Нектар жывога пачуцця:**
**Па з’явах ў люстры гэтых водаў**
**Знаходзіць шлях свайго народу**
**У віры спрадвечнага жыцця…** ***(С. Крывец).***



# Народныя традыцыі






Рубеж, калі адбывалася развітанне з летам і пачыналася восень, указваўся ў народзе па-рознаму. Відочныя знакі восеньскай пары прыкмячалі ўжо на Пятра, потым на Іллю, Спаса, Прачыстую, Флора і Лаўра. Умоўна лічыцца, што восень наступае ад пачатку верасня. Крыху панылыя, але яшчэ з праблiскамі сонца карціны першага восеньскага месяца малююць народныя прыкметы: **"Верасень — з досвіткам дзень",** паказваючы гэтым самым паступовае скарачэнне дня. Усё мацней бяруцца халады, звычнымі робяцца туманы, ападаюць лісты з дрэў, чырванеюць рабіны ("У верасні адна ягада — ды і тая горкая рабіна"). Але земляроб меў чым парадвацца пад час прыроднай сумоты, бо "верасень месяц халодны, але сыты". Нездарма ж гаварылася: "Як настане верасень — у гаспадара поўна гумно і кішэнь".

1. Андрэй, Піцірым, Цімафей, Агата, Тэкля.

2. Самуіл, Сявір.

3. Фадзей, Васа, Аўрам.

4. Апанас, Анфуса.

5. Дзень пакутніка Лупы (як і наогул першая дэкада верасня) прызнаваўся ўдалым для азімай сяўбы: "На Лупа будзе жыта купа". Павер'е магло нарадзіцца не толькі на падставе гукавога падабенства, але і па зрокавых асацыяцыях. Гаварылі, што ў дзень памяці святога Лупы нельга сеяць жыта, таму што на ўсёй ніве будуць "лупы" — жыта ўзыдзе і вырасце плешынамі. Так адзін і той жа вобраз у залежнасці ад мясцовай традыцыі надзяляўся супрацьлеглым стаўленнем да сялянскай працы ў гэты дзень.

6. Яўціхій, Іван, Пятро, Арсень, Георгій.

7. Варфаламей, Ціт, Міна, Яўлогій. Імя святога Варфаламся (у народзс — Баўтрамея) рыфмавалася з адлаведнымі аграрнымі работамі: "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей". У гэты ж дзень прадугледжваўся адлёт буслоў у вырай, іх зварот праз дзевяць месяцаў падмацоўваў тлумачэнне, што дзяцей прыносяць менавіта гэтыя птушкі: "Святы Баўтрамей высылае буслоў на дзяцсй". Па стану надвор'я на Варфаламея вызначалі характар усёй воссні.

8. Адрыян, Наталля.

9. Пімен, Анфіса, Сава.

10. Майсей невядома з якой прычыны шанаваўся як збавіцель ад п'янства, асабліва запойнага.

11. Дзень адсячэння галавы Іаана Прадцечы меў у народзе назвы: Іван Галавасек (Галаварэз, Сценцель), або Іван Калінавік (Каліннік). Адзначаўся праваслаўнай царквою строгім постам. Разнастайныя формы жалобы бытавалі і сярод простага люду, кожная парада ці забарона па-свойму лагічна выцякала з характару дня. На Галавасека нельга было есці круглых пладоў, каб не спадобіцца Ірадыядзе, якая забаўлялася галавою Іаана Хрысціцеля як яблыкам, і каб не садзілася ў бліжэйшы год на целе скуллё.

Баяліся варыць чырвонае бацвінне, бо, лічылі, у доме на працягу года пральецца чыя-небудзь кроў. Забаранялася рэзаць нажамі і сячы сякерамі ўсе, што мела круглыя абрысы, нават хлеб кроілі загадзя ці ламалі яго рукамі. Пад пагрозаю пажару рупіліся выпаліць напярэдадні ў печы і ўсяляк пазбягалі знозіць сена ў хлявы. Ужо сама назва свята падказвала паклапаціцца і пра ўласную галаву. А каб яна не балела, ламалі на Галавасека каліну, што якраз паспявала, і варылі з яе кісель ці кашу з аржаной мукой і цукрам. На Магілёўшчыне ў гэты дзень стараліся паболей заараць і засеяць жыта, якое, разлічвалі, будзе асабліва ўмалотнае. Пра дзень Галавасека ў песнях спявалі, што ён "руняй сцеліць" і "бульбу з поля збірaeць".

12. Аляксандр, Іван, Павел, Даніла.

13. Кіпрыян, Генадзь.

14. Сямён, Марфа. Дзень Сямёна Стоўпніка ("Стаўбуна") меркаваўся як апошні дзень сяўбы азімых: "Святы Сымон — а й сявец дамоў". Паводле народнага павер'я, жыта, пасеянае ў гэты дзень, не будзе баяцца павалу, будзе трымацца "станьком", высокае, але неўмалотнае. А каб засцерагчыся неўмалоту, няпоўных каласоў, забаранялі на Сымона малаціць, Павер'ям служыла сугучнасць: "семя" і "Сямён". У выніку гэты святы станавіўся нібы паверaным селяніна ў зерневай справе. Наогул селянін кожны этап да будучай сяўбы азімых "даручаў" асобнаму святому: "Да Пятра трэба зямлю паараць, да Іллі — узбаранаваць, да Вялікай Прачыстай — памяшаць і да Сямёна — жыта ўзараць". Яшчэ адляталі птушкі ў вырай. З Сымонам звязвалася павер'е, быццам ластаўкі хаваюцца на зіму ў ваду. На Сымона, як і раней на Баўтрамея, знішчалі ў хаце мух.

Другая палова верасня і пачатак кастрычніка ў народным календары звязваліся з пацяпленнем і насілі назву "бабінага лета". Яна паходзінь нібыта ад таго, што на гэты час прыпадала пераважна "бабская" работа на агародзе і ў полі. Лагоднае надвор'е спрыяла ўборцы гародніны, капанню бульбы; у гэты час церлі і трапалі лён і каноплі.

15. Хвядот, Руфіна, Іван, Антон, Хвядос.

16. Феафіл, Дарафей, Пятро, Зінон, Домна, Яўхім, Феакціст, Іван, Васіліса.

17. Вавіла, Майсей, Піліп, Хведар, Юльян.

18. Захар, Лізавета, Апанас, Глеб, Давыд, Максім, Хведар, Аўдзей, Раіса.

19. Дзень успаміну цуда Архістраціга Міхаіла па-народнаму называўся проста "Цуда". Гэга не было свята, і лічылі, калі хто сее жыта ды не ведае, што за дзень, то ўродзіць цудоўная збажына, а калі хто ўведае ці згадае, але не спыніць работу, — з ураджаю атрымаецца "цуда" наадварот. На Магілёўшчыне распачатую малацьбу спынялі ў дзень Цуда, бо яна, як і распальванне агню ў гумне (найверагодней па асацыяцыі з ударамі перуна і бліскамі маланкі), пагражае спаліць пабудову.

20. Сазонт, Іван, Макар, Серапіён, Лука.

21. Свята Ражства Маці Божай шмат у чым пераклікалася з Прачыстай, але было як бы рангам ніжэй, што выявілася і ў назвах: Малая (меншая, другая) Прачыстая (у параўнанні з Вялікай, большай, першай), Спожка (у параўнанні са Спажой), Другі святок. Пачынаўся адлік дням чарговай пары года: "Другі святок — восень, браток". Была і свая назва ў гэтага свята, што з найбольшай яскравасцю сведчыла пра канчатковы набытак селяніна з яго нівы — "Багач". І, як заўсёды,святочны дзень не толькі падагульняў зробленае, але і настройваў на далейшыя работы: "Багач — бярыся за рагач (саху), ідзі пад авёс гараць", альбо "Прыйшоў Багач — кідай рагач, бяры сявеньку, сей памаленьку".

# Народныя традыцыі



22. Якім, Ганна, Язэп, Хвядос, Феафан, Харытон, Мікіта.

23. Павел, Андрэй, Клімент, Пульхерыя, Пятро.

24. Хвядора, Сяргей, Герман, Дзмітрый, Ія. "На Тадору ўсякае лета канчаецца".

Ой, восень мая, восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала?
Я й не раненька, я й не пазненька —
Калі мая пара прыйшла:
Лісточак апаў, зямельку услаў,
Вось мая і пара прыйшла...

25. Сямён, Юльян, Хведар.

26. Лявонцій, Юльян. Лук'ян, Валяр'ян, Пятро.

27. Узвіжанне (Здзвіжанне) — так у наролзе называлася царкоўнае свята, звязанае з ушанаваннем крыжа, які ўздымаўся ("воздвмгался" — адсюль і назва свята) над натоўпам вернікаў. Народнае тлумачэнне назвы немудрагелістае: "К Здзвіжанню ўсё павінна быць здзвінута", г.зн. усе азімыя і яравыя павінны быць звезены з поля.

Чым далей гартаецца народны каляндар, тым часцей згадваецца пра надыход халадоў: "На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы". Гэта, па ўсім, апошняе свята, калі канчаткова раэвітваюцца з летам. "Ключы ад лета — у шызай галачкі, і яма, адлятаючы у цёплыя краі, замыкае яго і забірае з сабою ключы". Апрача адлёту птушак, вельмі значнай з'явай быў для народнага ўяўлення яшчэ адзін рух ("здзвіжанне") у прыродзе — выпаўзалі змеі і збіраліся разам, каб адыйсці ў зімовы сон да вясны: "Ва Узвіжання пару гадзюкі і вужакі хаваюцца ў нару". Першы вясновы і апошні восенькі змяіныя ўкусы лічыліся самымі небяспечнымі, таму на Узвіжанне пабойваліся хадзіць у лес, асабліва ж наказвалі тое дзецям. Нягледзячы на страх перад змеямі, Узвіжанне на Палессі з'яўлялася першым днём агульнага збірання журавін.

28. Мікіта, Акакій, Максім, Хвядот, Парфірый, Сцяпан. Язэп.

29. Віктар, Дарафей, Людміла, Язэп, Ісак. У каталіцкім календары гэта дзень Міхаіла, які прадказваў надвор'е: "Калі на Міхала з поўначы вее, то не мей на пагоду надзеі". Ясная ноч абяцала трывалую зіму.

30. Вера, Надзея, Любоў, Соф'я.

Калі на працягу верасня ліст на дрэвах трымаецца моцна — зіма няскора прыйдзе.



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

---

**Выстава “Сэрцам роднага слова краніся”**

**15 верасня** да Тыдня роднай мовы “Як ты дарага мне, мая родная мова!” у школьнай бібліятэцы арганізавана выстава “Сэрцам роднага слова краніся”. Увазе карыстальнікаў бібліятэкі прадстаўлены выданні па сучаснай беларускай мове, а таксама інтэлектуальныя і пазнавальныя гульні і заданні па беларускай мове і літаратуры.

**Выставу падрыхтавала Маргунова В.В.**



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

**Рэспубліканскі дыктант**

**17 верасня** наша краіна адзначае дзяржаўнае свята – Дзень народнага адзінства. Напярэдадні свята, **16 верасня**, вучні 8-11 класаў нашай школы напісалі рэспубліканскі дыктант “Дзень народнага адзінства”.

Мэта рэспубліканскай акцыі – выхаванне ў вучняў паважлівага і адказнага стаўлення да гісторыі беларускага народа, фарміраванне ўсведамлення непарыўнай сувязі гісторыі і сучаснасці, важнасці народнага яднання на шляху да росквіту Радзімы.

**Пышнюк А.А., кіраўнік МА настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры**





# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

## У нашым сэрцы назаўсёды

**17 верасня споўнілася 110 год з дня нараджэння Максіма Танка**, знакамітага паэта Беларусі. У рамках Тыдня роднай мовы “Як ты дарага мне, мая родная мова!” для вучняў 11 класаў і 9 “Б” класа была арганізавана творчая акцыя “Чытаем Танка разам”. Старшакласнікі чыталі перад аўдыторыяй творы паэта, якія выклікалі ў сэрцах школьнікаў моцныя ўражанні. А потым абмяркоўвалі пачутае, выказваючы свае эмоцыі. Бясспрэчна, такія акцыі не толькі ўзбагачаюць духоўны свет старшакласнікаў, але і спрыяюць развіццю чытацкага густу школьнікаў, а таксама папулярызацыі беларускай мовы.

**Пышнюк А.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры**





# Папулярызацыя беларускай мовы



**Акцыя "Воблака слоў"**

**21 верасня** ў межах Тыдня беларускай мовы вучні **10 "А"** класа прынялі ўдзел у **акцыі "Воблака слоў".** Тэхналогія "Воблака слоў" — гэта спіс слоў, якія асацыятыўна звязаны з пэўнай тэмай ці канкрэтным словам. Дзеці атрымалі розныя формы, якія трэба было запоўніць словамі-асацыяцыямі. Вучні з цікавацю выконвалі прапанаванае ім заданне. Такі метад спрыяе ўзбагачэнню слоўнікавага запасу, пашырэнню арфаграфічнай пільнасці.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры, Гарэева В.М.**





# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

**Беларуская скарбонка**

**21 верасня** ў рамках тыдня роднай мовы **вучні 7 "Б"** класа наведалі **Магілеўскую абласную бібліятэку імя У.І. Леніна**, дзе сталі ўдзельнікамі інтэлектуальнай гульні **"Беларуская скарбонка".** Сямікласнікі з задавальненнем удзельнічалі ва ўсіх этапах віктарыны, заданні якой былі звязаны з беларускай гісторыяй, літаратурай і мовай. Удзельнікі змаглі правільна назваць усе дзяржаўныя сімвалы краіны, святы, хутка перакладалі назвы садавіны і гародніны на беларускую мову, падбіралі іншамоўныя адпаведнікі да беларускіх слоў, правільна прыгадвалі выказванні беларускіх пісьменнікаў. З лёгкасцю гульцы справіліся з конкурсамі, дзе трэба было працягнуць беларускія прыказкі і прымаўкі, адгадаць загадкі.

Гэта мерапрыемства паказала, з якой цікавасцю і любоўю юнакі і дзяўчаты ставяцца да роднай мовы.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**








# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

### Прэзентацыя віншавальных паштовак “Пажаданні роднай мове”

**22 верасня** ў межах Тыдня роднай мовы для вучняў **6 “Б”** класа было праведзена пазакласнае мерапрыемства **“Прэзентацыя віншавальных паштовак”.**

Вучні падрыхтавалі лісты, паштоўкі, прысвечаныя роднай мове, у якіх выказвалі свае пажаданні. Віншаванні атрымаліся змястоўнымі і цікавымі. Удзельнікі ўважліва слухалі ўсе прэзентацыі.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**







# Папулярызацыя беларускай мовы



## “Мая Радзіма”

**22 верасня** ў рамках папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры вучні 5-ых класаў прынялі ўдзел у мерапрыемстве “Мая Радзіма”. Загадзя вучням трэба было падрыхтаваць пісьмовыя выказванні на прапанаваную тэму. Вучні творча падышлі да выканання пісьмовага задання. У сваіх выказваннях дзеці раскрылі такія тэмы, як гонар за нашу Радзіму, прыгожосць беларускай зямлі, пачуццё патрыятызму, славутае гістарычнае мінулае краіны і інш. Пасля выказванняў вучні ўзгадвалі вядомыя беларускія прыказкі і прымаўкі, прысвечаныя Радзіме.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

**Творчы конкурс «За што я люблю родную зямлю»**

**23 верасня** ў рамках Тыдня роднай мовы **вучні** 5 «Б» класа прынялі ўдзел у творчым конкурсе **«За што я люблю родную зямлю»**. Дзеці падрыхтавалі выступленні пра прыгажосць роднага краю, пра культуру народа, пра гістарычнае мінулае, пра родную мову, зрабілі маляўнічыя ілюстрацыі, выказалі ўласныя думкі.

Усе разважанні былі вельмі цікавыя, а малюнкі дапоўнілі творчую работу.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**







# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

**Выстава “Зямлі роднай кругавод”**

**23 верасня вучні 5 “Г”** класа ў рамках Тыдня беларускай мовы наведалі **Магілёўскі музей этнаграфіі**. Для дзяцей была праведзена экскурсія “Зямлі роднай кругавод”. Вучні здзейснілі невялікае падарожжа ў часе па беларускай вёсцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя, дзе змаглі зазірнуць у сялянскую хату з традыцыйным для канца XIX стагоддзя інтэр’ерам (печ, палаці, “чырвоны кут”, люлька з немаўляткам). З цікавасцю дзеці слухалі пра чараду святаў гадавога цыкла сялянскага жыцця (Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Вялікдзень, Купалле і інш). Апошні музейны раздзел пазнаёміў вучняў з традыцыйнымі рамеснымі вырабамі (ткацтва і вышыўка, салома — і лозапляценне, ганчарства), а народныя майстры паказалі прыёмы іх вырабу.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**

### Гучы, роднае слова!

23 верасня ў рамках Тыдня роднай мовы вучні 6 “В” класа сталі ўдзельнікамі пазнавальнай віктарыны “Гучы, роднае слова!”, якая садзейнічала пашырэнню ведаў вучняў пра беларускую мову, развіццю лагічнага мыслення, памяці, кемлівасці і спрыяла выхаванню ўзаемадапамогі, сяброўства, калектывізму. Вучні 6 «В» класа з радасцю і захапленнем адгадвалі загадкі, гулялі ў перакладчыкаў, паспяхова рашалі моўныя прапорцы. Атмасфера ў час мерапрыемства была радаснай і добразычлівай.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**



# Юбілейныя даты

Калейдаскоп
верасень 2022



# Юбілейныя даты





# Юбілейныя даты





# Літаратурная старонка





# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**верасень 2022**






**Рэдактар Юрчанка С.А.**